# ВЫКРАДЗЕНЫЯ З НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ КНІГІ ВЕРНУЦЦА НА РАДЗІМУ

Учора «Звязда» ўжо паведамляла аб затрыманні праваахоўнікамі траіх грамадзян, якія падазраюцца ў выкраданні з аддзела рэдкіх выданняў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі 12 каштоўных кніг. Стала вядома, што ў рукі правасуддзя трапіў і чацвёрты ўдзельнік гэтай гучнай справы, які вышукваўся.

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, супрацоўнікам Следчага камітэта і ГУУС Мінгарвыканкама спатрэбілася менш за месяц, каб раскрыць усе акалічнасці гэтага злачынства. У прыватнасці, аператыўнікамі было ўстаноўлена, што ўжо на другі дзень пасля крадзяжу рарытэты былі вывезеныя ў Маскву, дзе іх набыў прыватны калекцыянер. Дарэчы, «ганарар», які выплаціў пакупнік за кнігі, у паўтара раза перавысіў 22,6 мільёна рублёў. Нагадаем, што апошняя лічба называлася пры ацэнцы каштоўных выданняў на ўнутраным рынку. Улічваючы той факт, што кнігі хутка знайшлі свайго пакупніка, праваахоўнікі не выключаюць версіі аб заказным характары злачынства. Пакупнік выкрадзеных з Нацыянальнай бібліятэкі кніг таксама затрыманы, а выданні канфіскаваныя. Зараз у Маскве знаходзіцца група супрацоўнікаў МУС Беларусі, задача якіх — у кароткія тэрміны вярнуць каштоўныя выданні на радзіму. Усім фігурантам гэтай справы ўжо прад'яўлена абвінавачанне па артыкулу 205 ч.1 КК — «крадзеж, учынены арганізаванай групай або ў асабліва буйным памеры».

Ігар ГРЫШЫН.